**“Спадчына Напалеона Орды” (2007 г.)**

Праект рэалізаваны ў 2007 г. да 200-гадовага юбілею вядомага кампазітара, музыканта, педагога, мастака, грамадскага дзеяча Напалеона Орды (1807–1883). Вынікам праекта стала электроннае выданне “Спадчына Напалеона Орды”, у якім прадстаўлена творчая спадчына знакамітага дзеяча. Выданне змяшчае біяграфічныя звесткі пра Н. Орду, бібліяграфічны спіс, электронныя копіі яго твораў (збор 188 літаграфій з выявамі гістарычных мясцін Беларусі, Латвіі, Літвы, Малдовы, Польшчы, Украіны, 2 выданні Н. Орды – “Граматыка польскай мовы” і “Граматыка музыкі”), музычныя творы Н. Орды, а таксама яго эпісталярную спадчыну.